Н. А. КОМЛІК-ЯМАЦІНА

# ЭЛЕМЕНТЫ СТАРАЖЫТНАЙ СІМВОЛІКІ НА ГЕРБЕ РОДУ ТЫШКЕВІЧАЎ / ELEMENTAI SENOVĖS SIMBOLIAI ANT HERBO TIŠKEVIČIŲ

N. KOMLIK-YAMATINA

# ELEMENTS OF ANCIENT SYMBOLS ON THE COAT OF ARMS OF TYSHKEVICHS FAMILY

*The aim of the research is to describe sense of ancient symbols on Tyshkevichs family coat of arms.*

*The methods used are as follows: comparative analysis, theoretical reconstruction, semiotic analysis.*

*Tyshkevichs is an ancient famous family. Its coat of arms is named «Lialiva». There are two ancient symbols: crescent and hexagram on it. The author of this article explains the meaning of these symbols from the viewpoint of semiotic, not heraldry.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сімвалы з’яўляюцца адным з самых старажытных і загадкавых феноменаў чалавечага быцця. З’явіўшыся на світанку чалавечай культуры (наскальныя роспісы ў пячорах Ласко, сімвалы на старажытнаегіпецкіх храмах і інш.), сімвалы працягваюць актыўна выкарыстоўвацца ў розных галінах жыццядзейнасці чалавека і сёння. Аднак навуковую цікавасць сімволіка разнастайных культур пачала выклікаць адносна нядаўна, з канца XIX – пачатку XX ст., калі позіркі філосафаў скіраваліся на праблему знака: Чарльз Сандэрс Пірс (Charles Sanders Peirce), Сьюзэн Лангер – у Амерыцы; Фердынанд дэ Сасюр, Эрнст Касірэр, Ралан Барт – у Еўропе; Юрый Лотман, Уладзімір Тапароў і іншыя прадстаўнікі Тартуска-Маскоўскай семіятычнай школы – у Расіі. З’явілася асобная навуковая дысцыпліна – семіялогія, аб’ектам і прадметам даследавання якой з’яўляюцца знакі і сімвалы.

Цесна пераплецена з семіялогіяй геральдыка – з другой паловы XIX ст. дапаможная гістарычная дысцыпліна, якая вывучае гербы; раней, у XIII ст., – складанне шляхецкіх, цэхавых і зямельных гербаў. Вывучэннем гербаў, іх гісторыі, сімволікі займалася шмат філосафаў, гісторыкаў, этнографаў і інш.: Джавані Санці-Мадзіні, Сцівен Слэйтар, Мішэль Пастуро (Michel Pastoureau), Артур Фокс-Дэвіс, Аляксандр фон Вальбарт і інш. – у Еўропе, У. К. Лукомскі, М. М. Старадубцаў, М. Ю. Мядзведзеў, Ю. У. Арсеньеў – у Расіі. У

Беларусі ў галіне вывучэння геральдыкі пачэснае месца займае гісторык і геральдыст Анатоль Кірылавіч Цітоў.

Абапіраючыся на працы вышэйпералічаных навукоўцаў, а таксама на даследаванні апошняга часу (У. Эка, Ю. Крысцева, В. У. Іваноў і інш.), у дадзеным артыкуле ў межах семіятычнага падыходу разглядаецца герб роду Тышкевічаў – «Ляліва».




У адпаведнасці з методыкай апісання герба, якая была прапанавана знакамітым італьянскім гісторыкам і геральдыстам Джавані Санці-Мадзіні, герб можа быць прадстаўлены ў трох формах: малой, сярэдняй і вялікай. Малая форма – шчыт з асноўным сімвалам; сярэдняя – дадаецца шлем з нашлемнікам (пёры, рогі, крылы і т. п.), карона (як ідэнтыфікатар ступені шляхетнасці); вялікая форма ўключае ўсе элементы герба: шчыт, шлем, нашлемнік, карону, тых, хто трымае шчыт, мантыю, дэвіз [15; 12, с. 45–47, 273–275].

Апісанняў гэтага герба існуе нямала, сваімі каранямі ён сыходзіць у XIV ст. [18; 19]. З гэтай нагоды спыняцца на падрабязным разглядзе другасных элементаў герба «Ляліва» (такіх, як карона, пёры паўліна і інш.) не будзем, у дадзеным артыкуле нас больш цікавіць малая форма герба, г. зн. яго асноўны сімвал – шасціканцовая зорка над «паравернутымі дагары рожкамі месяца».

Геральдычная навука не дае тлумачэння гэтаму злучэнню нябесных цел, толькі яго апісанне: «Должна быть луна, как на новую, неполной, рогами вверх обращенной, в середине ее звезда о шести лучах в поле синем либо, как некоторые используют, в красном; луна должна быть золотой» [8, с. 66].



Калі звярнуцца да разнастайных энцыклапедый і слоўнікаў па сімволіцы [2–5; 11], заўважна, што такое злучэнне сустракаецца вельмі часта і вытокі падобнай выявы ўзыходзяць да самых старажытных з вядомых нам культур. Напрыклад, сімвал з шумерскай культуры (III тыс. да н. э.) [16]. Акрамя таго, узыходзячы (няпоўны, паравернуты рожкамі ўверх) месяц амаль заўсёды сустракаецца на гравюрах,

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

якія паказваюць вялікую багіню (старажытнагрэчаскую Селену, старажытнаегіпецкую Мут, у міфалогіі майя – Іксчэл (Ішчэль), багіню месяца, месячнага святла і вясёлкі [20] і інш.) (гл. дадатак А).

У межах семіятычнага падыходу практычна ва ўсіх старажытных культурах узыходзячы месяц (чаша) сімвалізуе жаночы пачатак – як пасіўнае нябеснае цела, святло якога – адбітак актыўнага святла сонца (мужчынскі пачатак). Акрамя таго, у рожках месяца некаторыя семіётыкі бачаць сімвал рагатай багіні – першаснага жаночага бажаства (эпоха матрыярхату), якое ў злучэнні з мужчынскім пачаткам (богам, прыбогам) нараджае ўвесь існуючы свет, дае жыццё ўсім раслінам, жывёлам і людзям.

Таксама ўзыходзячы месяц сімвалізуе сасуд: «Иногда лунное, как правило женское, божество стоит на серпе, который тогда мыслится чем-то вроде судна или чаши. В этом случае луна становится символом женского начала мира – лона (йони), из которого рождается всё живое» [2, с. 257–258].

Хрысціянская сімволіка працягвае гэтую традыцыю. Шмат на якіх выявах альбо Панна Марыя стаіць на сярпе месяца, альбо ён знаходзіцца побач з ёй, падтрымліваючы маленькага Ісуса (гл. дадатак Б).

Такім чынам, узыходзячы месяц ва ўсіх сусветных культурах трактуецца як жаночы пачатак (які ў зліцці з мужчынскім дае жыццё) альбо як сасуд, гатовы для напаўнення.



Шасціканцовая зорка – гексаграма – уяўляе сабой не менш старажытны сімвал. Складаецца з двух пераплеценых роўнабаковых трыкутнікаў, вяршыні якіх скіраваны ў супрацьлеглыя бакі: уверх – агнявы мужчынскі пачатак, уніз – вільготны жаночы. Гэта сімвал «дуалістычнай сістэмы ў гарманічным зліцці» [3, с. 52]. Таксама гэта яднанне чатырох стыхій: агню, вады, паветра, зямлі.

У алхіміі зліццё першасных стыхій уяўляе сабой праматэрыю, падобным чынам гексаграма трактуецца ў масонаў [3, с. 53]. Калі працягнуць ланцужок лагічных разважанняў, можна прыйсці да высновы, што праматэрыяй метафарычна названы сакральныя веды: ідэя ў старажытных грэкаў, слова – у вавіланян, святыя гімны – у Старажытнай Індыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У хрысціянскай традыцыі гексаграмай знакаміты цар Саламон, сын цара Давіда і Вірсавіі, «изгонял демонов и привлекал ангелов» [3, с. 53]. З гэтай нагоды шасціканцовая зорка носіць назву «Саламонава зорка (пячатка)» ці «Шчыт Давіда». Пазней гэты сімвал пачаў асыцыявацца з мудрасцю цара Саламона і абазначаць веды.

У будыстаў шасціканцовай зоркай азначаны чакры анхата (анахата) (у цэнтры грудзей па лініі сэрца) і сахасрара (на макушцы галавы) – вузел мудрасці і вузел розуму адпаведна [4, с. 149–153] (гл. дадатак В). Таксама гексаграма выкарыстоўвалася ў «вядзьмарскіх» кнігах як сімвал улады над дэманамі (прыроднымі стыхіямі). Уладу над стыхіямі могуць даць толькі ісцінныя веды, адпаведна ў магічнай практыцы шасціканцовую зорку можна лічыць сімвалам ведаў і мудрасці. У сучаснасці ў сусветнай культуры і замацаваўся гэты сэнс.

Такім чынам, аснова герба Тышкевічаў (і яшчэ некалькіх сотняў родаў Беларусі, Літвы, Украіны) складаецца з двух старажытнейшых сімвалаў: узыходзячага месяца і шасціканцовай зоркі. Першы мае два асноўныя ўзаемазвязаныя сэнсы: жаночы пачатак і сасуд. Другі – сімвал ведаў, мудрасці. У выніку атрымоўваецца наступнае тлумачэнне герба «Ляліва»: сасуд, гатовы да напаўнення ведамі. Для герба гэта не зусім звычайны сэнс: асноўная асаблівасць роду не ў гонары і мужнасці ў бойцы, не ў моцы і спрыце ў ваярскай справе, не ў матэрыяльных каштоўнасцях і шляхетнасці, а ў імкненні да духоўных вяршынь, да спасціжэння ісціны і набыцця новых ведаў. І сёння думаецца: ці не паўплываў сімвалічны сэнс родавага герба на лёс знакамітых прадстаўнікоў рода Тышкевічаў – Пія і яго сыноў Канстанціна і Яўстаха, наканаваўшы ім праславіцца ў навукова-даследчай дзейнасці.

1. *Адамушко, В. И.* Гербы и флаги Беларуси / В. И. Адамушко, М. М. Елинская. – Минск : Беларусь, 2006. – 254 с.

2. *Бауэр, В.* Энциклопедия символов / В. Бауэр, И. Дюмотц, С. Головин; пер. с нем. Г. Гаева. – М. : Крон-Пресс, 1998. – 512 с.

3. *Бидерман, Г.* Энциклопедия символов / Г. Бидерман ; пер. с нем. В. М. Валькова. – М. : Республика, 1996. – 334 с.

4. *Бир, Р.* Энциклопедия тибетских символов и орнаментов / Р. Бир ; пер. с англ. Л. Бубенковой. – М. : Ориенталия, 2011. – 428 с.

5. *Генон, Р.* Символы священной науки / Р. Генон; пер. с фр. Н. Тирос. – М . : Беловодье, 2002. – 496 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. *Лангер, С.* Философия в новом ключе: исследование символики разума, ритуала и искусства / С. Лангер ; пер. с англ. С. П. Евтушенко ; общ. ред. и послесл. В. П. Шестакова. – М. : Республика, 2000. – 287 с.

7. *Лотман, М. Ю.* Статьи по семиотике культуры и искусства / М. Ю. Лотман; сост. М. С. Гргорьева. – СПб. : Академ. проект, 2002. – 544 с.

8. *Лукомский, В. К.* Гербы третьей части Гербовника дворянских родов Царства Польского / В. К. Лукомский, С. Н. Тройницкий. – СПб. : 1910. – [12] с., 121 табл., [10] с.

9. Мировые культы и ритуалы. Могущество и сила древних / сост. Ю. Матюхина. – М. : РИПОЛ классик, 2011. – 174 с.

10. *Привалова, В. М.* Орнаментальная культура. Аналитический обзор символов и знаков геометрического орнамента в антропологической картине мира / В. М. Привалова // Изв. Самар. науч. центра РАН. Сер. Искусствоведение. – 2010. – Т. 12, № 3. – С. 255–263.

11. *Рошаль, П.* Энциклопедия символов / П. Рошаль. – М. : АСТ ; СПб. : Сова, 2011. – 1007 с.

12. *Санти-Мадзини, Дж.* Геральдика. История, терминология, символы и значения гербов и эмблем / Дж. Санти-Мадзини, А. П. Черных; пер. с итал. Т. А. Бобровой [и др.]. – М. : Астрель : АСТ, 2007. – 593 с.

13. *Эко, У.* Отсутствующая структура. Введение в семиологию / У. Эко ; пер. с итал. А. Г. Погоняйло и В. Г. Резник; ред. М. Г. Ермакова. – М. : Петрополис, 1998. – 432 с.

14. *Hall, James.* The illustrated dictionary of symbols in Eastern and Western art. / J. Hall. – Colorado: IconEditions, 1995. – 256 p.

15. Составные части герба // Экскурс в геральдику. – URL: http://www.excurs.ru/pravila/armature/Armature.htm.

16. Полумесяц // Энциклопедия геральдических символов. – URL: http://www.symbolarium.ru/index.php.

17. Звезда // Энциклопедия геральдических символов. – URL: http://www.symbolarium.ru/index.php.

18. Лелива // энциклопедия гербов. – URL: http://www.heraldicum.ru/polgerby.htm.

19. Leliwa // энциклопедия гербов польских. – URL: http://gajl.wielcy.pl/herby_nazwiska.php?lang=pl&herb=leliwa.

20. Иксчель // энциклопедия древнеегипетских богов. – URL: http://godsbay.ru/maya/ixchel.html.

21. Лагойск // Гербы беларускіх гарадоў. – URL: http://geraldika.by

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




Выява багіні месяца (стаіць на сярпе ўзыходзячага месяца
і трымае такі ж паўмесяц у правай руцэ)



Выява з алхімічнага трактата сімвалізуе саюз багіні-маці і бога-бацькі
(месяца і сонца)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




Панна Марыя з немаўляткам Ісусам на сярпе ўзыходзячага месяца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дадатак В




Сістэма чакраў у індуісцкай кундаліні-ёзе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ